Палажэнне аб конкурсе
прафесійнага майстэрства
на лепшае масавае мерапрыемства
«Чытаем беларускую кнігу»

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Сапраўднае палажэнне вызначае ўмовы і парадак арганізацыі і правядзення конкурсу на лепшае масавае мерапрыемства па папулярызацыі творчасці беларускіх пісьменнікаў-юбіляраў 2023 года.

1. 2. Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца:

дзяржаўная ўстанова культуры «Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С.Пушкіна» (далей – установа);

прафсаюзны камітэт першаснай прафсаюзнай арганізацыі ўстановы.

1.3. Удзельнікамі конкурсу з'яўляюцца ўсе структурныя падраздзяленні ўстановы.

**2. Мэты і задачы конкурсу**

1. Конкурс накіраваны на актывізацыю працы бібліятэк у папулярызацыі твораў на беларускай мове і рэалізацыю творчага патэнцыялу бібліятэкараў.
2. Павышэнне ролі беларускай літаратуры ў маральным, эстэтычным і патрыятычным выхаванні карыстальнікаў.
3. Пошук эфектыўных форм работы з карыстальнікамі ў гэтым напрамку.
4. Павышэнне прэстыжу бібліятэкі як сучаснага інфармацыйнага і культурнага цэнтра.

**3. Умовы і парадак правядзення конкурсу**

3.1. Конкурс праводзіцца з 1 лютага па 31 жніўня 2023 года.

3.2. Бібліятэкі-ўдзельнікі конкурсу самастойна выбіраюць чытацкую катэгорыю, для якой будзе праведзена мерапрыемства.

3.3. Да 5 верасня 2023 года прадстаўляюцца у аддзел бібліятэчнага маркетынгу установы сцэнарый, мультымедыйную прэзентацыю, фатаграфіі, тлумачальную запіску да конкурснай работы.

3.4. Да конкурснага матэрыялу можа быць прыкладзена інфармацыйная прадукцыя: буклеты, закладкі, спісы і т.п.

3.5. Афіцыйная аб'ява пераможцаў адбудзецца ў верасні 2023 года.

**4. Крытэры ацэнкі конкурсных работ**

Пры ацэнцы конкурсных матэрыялаў будзе ўлічвацца:

4.1. Адпаведнасць матэрыялу ўзроставым асаблівасцям аўдыторыі.

4.2. Прымяненне інавацыйных форм работы.

4.3. Нагляднасць (выкарыстанне дэкарацый, касцюмаў, экспазіцый, кніжных выставак, тэм. паліц і г.д.).

4.4. Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій пры арганізацыі масавага мерапрыемства (выкарыстанне фота, аўдыё матэрыялаў, відэаматэрыялаў, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменнікаў).

4.5. Наяўнасць тэатралізаваных, музычных, паэтычных элементаў для рэалізацыі мастацкай задумы.

4.6. Наяўнасць бібліяграфічнай прадукцыі.

4.7. Сцэнарый масавага мерапрыемства павінен быць складзены ў адпаведнасці з метадычнымі рэкамендацыямі.

**5. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў**

5.1. Вынікі конкурсу падводзяцца на пасяджэнні журы (дадатак 1).

5.2. Журы вызначае пераможцу і ўстанаўлівае першае, другое і трэцяе месца.

5.3. Пераможцы конкурсу, якія занялі першае, другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца дыпломамі і грашовымі прэміямі:

1 месца - дыплом і грашовая прэмія ў памеры да 2 базавых велічынь;

2 месца - дыплом і грашовая прэмія ў памеры да 1,5 базавай велічыні;

3 месца - дыплом і грашовая прэмія ў памеры да 1 базавай велічыні ад прафсаюзнага камітэта першаснай прафсаюзнай арганізацыі ўстановы.

Узгоднена:
Старшыня прафсаюзнага камітэта
дзяржаўнай установы культуры
«Мазырская цэнтральная раённая
бібліятэка імя А.С. Пушкіна»
________________2023